ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 26 (1295) | ПАНЯДЗЕЛАК, 2-га лютага 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 "
6 месяцаў	1 р. 80 "
1 год	3 р. 30 "

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Краіна кліча

НА РЫШТАВАНЬНІ

Мы сталі на парозе будаўнічага сэзону, які ў выкананьні пляну 3 году пяцігодкі зьяўляецца рашаючым, калі павінна закончыцца пабудова новых буйных волатаў соцыялістычнай гаспадаркі, сэзонам яшчэ больш шпаркіх бальшавіцкіх тэмпаў.

Вузкім месцам у рабоце комсамольскай організацыі па соцыялістычнаму будаўніцтву зьяўляецца плянаваньне, транспарт і капітальнае будаўніцтва. Комсамол яшчэ недастаткова аўладаў гэтымі вучасткамі. Тав. Палякоў у сваім дакладзе на X зьезьдзе ЛКСМБ адзначыў, што „адстаючым вучасткам зьяўляецца наш удзел у капітальным будаўніцтве. Комсамольскія організацыі вельмі мала цікавіліся гэтым пытаньнем і недастаткова працавалі па выкананьню пляну, зьніжэньню сабекошту і павышэньню якасьці будаўніцтва“.

Будаўнічы сэзон 1931 г., рашаючага году пяцігодкі, павінен унесьці пералом у галіне ўдзелу комсамольскай організацыі ў капітальным будаўніцтве.

„Будаўнічыя ячэйкі ў параўнаньні з фабрычна-заводзкімі, працуюць значна горш. Вядома, што гэта нельга тлумачыць об'ектыўнымі ўмовамі, раскіданасьцю і інш. Тут трэба не спасылацца на об'ектыўныя ўмовы, а праводзіць сапраўдную бальшавіцкую работу“ (з дакладу т. Палякова).

Матар'ялы з месц сьведчаць аб тым, што падрыхтоўка да будаўнічага сэзону разгортваецца надзвычайна марудным тэмпамі. Урокі зрыву леташняга сэзону паасобнымі будаўнічымі організацыямі ня ўлічваюцца. Абураючая бясплянавасьць яшчэ дагэтуль пануе на пабудовах. Для будаўніцтва Дому Ураду летась чарцяжы былі гатовы толькі для 6 паверху, а для падвальнага ня было. Гэта-ж самае паўтараецца і зараз.

Комсамольскія організацыі на будаўніцтве ня сталі яшчэ ў першыя шэрагі барацьбітоў за лепшую падрыхтоўку да сэзону, за непрымірымую барацьбу з закаранеласьцю і опортуністычнай практыкай, якія яшчэ пануюць на многіх будаўнічых організацыях.

Да пачатку будаўнічага сэзону комсамольская організацыя павінна зьявіцца ініцыятарам баявых вытворчых манэўраў на будаўніцтве. Манэўры дадуць магчымасьць мобілізаваць увагу ўсіх будаўнікоў на тое, каб зьнішчыць недахопы і лепш падрыхтавацца да сэзону.

Будаўнічыя ячэйкі комсамолу павінны яшчэ больш мобілізаваць свае сілы, каб рашэньні X зьезду ЛКСМБ і IX УсеЛКСМ аб паглыбленьні павароту комсамолу тварам да вытворчасьці былі ажыцьцёўлены ў гэтым сэзоне.

Комсамол павінен кінуць усе свае сілы на ліквідацыю „вузкіх“ месц у будаўніцтве, на разгортваньне плянава-опэрацыйнага руху, выкарыстоўваючы ўсе магчымасьці для таго, каб будаўнічы сэзон гэтага году даў найлепшыя вынікі ў выкананьні і перавыкананьні будаўнічых плянаў.

Да пачатку сэзону засталося мала часу. Аўладаць гэтым адсталым вучасткам нашага ўдзелу ў гаспадарчым будаўніцтве, зрабіць карэнны пералом у становішчы падрыхтоўкі да сэзону—баявая задача ўсёй комсамольскай організацыі.

Пачаўся процэс баявой дружыны ППС

ВАРШАВА, 30. Пачаўся вядомы процэс баявой дружыны ППС, абвінавачванай у організацыі замаху на Пілсудзкага. На лаўцы падсудных: Ягазьдзінскі, Джэмзялеўскі (пэпээсаўскі дэпутат, удзельнік тэрорыстычнага акту супроць варшаўскага царскага генэрал-губарнатара Калёна) і трое радавікоў.

Адзін з галоўных організатараў „замаху“—Туржынскі аказаўся тайным агентам паліцыі і выступае на процэсе ў якасьці галоўнага сьведкі абвінавачваньня. За ім у якасьці сьведкі абвінавачваньня выступае провокатар Грэдзі, які да апошняга часу знаходзіўся на чале варшаўскай паліцыі ППС.

Справа аб „замаху“ на Пільсудзкага, якая была прадстаўлена пэпээсаўскім друкам як адзін з прадвыбарных крыкаў польскай ахранкі, у сапраўднасьці прадстаўляецца значна больш складанай. Згодна паказаньня галоўнага падсуднага Ягазьдзінскага, замах на Пільсудзкага ім сапраўды інсцэніраваўся з мэтай выявіць провокатараў, якіх паліцыя пасылала ў вялікай колькасьці ў ППС. Туржынскі дзейнічаў па даручэньню паліцыі і ўсяляк дапамагаў Ягазьдзінскаму ў інсцэніроўцы замаху, які быў у гэты час надзвычайна на руку пілсудчыкам і паліцыі.

Старшыня сойму зацiскае рот комуністым

ВАРШАВА, 31.— На паседжаньні сойму комуністычны дэпутат тав. Данецкі выступіў а заявай, што старшыня сойму заціскае рот комуністым.

Старшыня сойму прызваў тав. Данецкага да парадку, а потым выключыў на месяц.

9.000 рабочых Калькуты забаставалі

ЛЁНДАН.—Як паведамляюць з Індыі, у Калькуце 9000 рабочых джутавых фабрык абвясьцілі забастоўку протэсту супроць мяркуемага скарачаньня 5000 рабочых.

Пасьля мітынгу забастоўшчыкі накіраваліся на рынак і патрабавалі ад гандляроў зьнізіць цэны на харчы. Паўофіцыёз „Ассошыэйтэдт Прэс Індыя“ паведамляе, што ў Баргорадзе забаставала 1.800 тэкстыльшчыкаў, выступаючых супроць скарачаньня зарплаты.

Налёт паліцыі на памяшканьне компартыі

НЬЮ-ЁРК, 31. Паліцыя зрабіла налёт на памяшканьне комуністычнай партыі і рэвалюцыйнай Лігі профсаюзнага адзінства ў Бірмінгаме (штат Алябама). Арыштавана 5.

БАЯВОЕ ПРЫВІТАНЬНЕ БРЫГАДАМ КОЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ, ЯКІЯ ВЫЯЖДЖАЮЦЬ НА ОРГАНІЗАЦЫЮ КОЛГАСНАГА ПРЫЛІВУ

„Зараз ужо... самі сяляне з колгасьнікаў, дзесяткі тысяч сялян організатараў і агітатараў колгаснай справы—будуць несьці ўперад сьцяг колектывізацыі“ (СТАЛІН)

Падцягнем адстаючых

Менск, 2 лютага

Заўтра ў шэраг раёнаў БССР выяжджаюць брыгады з старых колгасьнікаў. Брыгады організаваны па ініцыятыве газэты „Беларуская Вёска“ з ударнікаў лепшых колгасаў Беларусі.

Задача брыгад—перадаць вопыт работы сваіх колгасаў, іх барацьбу на гаспадарчых франтох, організаваць новы колгасны прыліў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у колгасы, узяць на буксір адстаючыя ў колектывізацыі і падрыхтоўцы да вясеньняй пасеўкампаніі раёны.

Кожная брыгада вязе з сабой багаты матар'ял з сваіх колгасаў,—фактамі і лічбамі давядуць яны перавагу буйнай соцыялістычнай гаспадаркі над аднаасобнай. У брыгады таксама ўключаны прадстаўнікі газэты „Беларуская Вёска“ і пісьменьнікі.

Брыгады паедуць у Межынскі, Сеньненскі, Церахаўскі, Заслаўскі, Лепельскі і Чавускі раёны, якія адстаюць у колектывізацыі і падрыхтоўцы да вясеньняй пасеўкампаніі.

Вітаючы і падтрымліваючы гэтую каштоўную ініцыятыву газэты „Беларуская Вёска“, рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена“ заклікае ўвесь комсамол Беларусі надхапіць гэты пачын і ператварыць яго ў рух тысяч мас комсамольцаў, колгасьнікаў—ударнікаў для пасьпяховага ажыцьцяўленьня задач партыі па суцэльнай колектывізацыі і, на яе аснове, ажыцьцяўленьне палітыкі ліквідацыі кулацтва як клясы.

Марудная падрыхтоўка

Рудзенск. I—II (Па тэлефону ад нашага юнкора)—Падрыхтоўка да веснавой сяўбы ў Рудзенскім сельсавеце, Сьмілавіцкага раёну, праходзіць марудна. Заданьне—пашырыць пасеўную плошчу на 300 га не даведзена да кожнай вёскі.

У сельсавеце тры трыеры сыстэмы „Трыумф“ не нагружаны поўнасьцю.

Недастаткова праводзіцца работа па організацыі новых колгасаў. За апошні час у колгасы ўліліся толькі 12 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Сельсавет у гэтай галіне бязьдзейнічае.

Няма бальшавіцкіх тэмпаў у падрыхтоўцы да вясеньняй пасеўкампаніі і ў колгасах сельсавету.

Пост „Ч. З“.—Г. Ф.



На здымку: рэгістрацыя ў рэдакцыі „Бел. Вёска“ брыгадзіраў-ударнікаў, якія выяжджаюць на організацыю колгаснага прыліву.

У ленінскія дні організаваны 4 колгасы

У сувязі з Ленінскімі днямі, па шэрагу вёсак Сьмілавіцкага раёну распачаўся ленінскі прыліў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у колгасы.

За апошні тыдзень організаваны 4 колгасы, з якіх адзін колгас імя Леніна ў вёсцы Старына, у які ўступіла 15 гаспадарак.

Акрамя гэтага, у шэрагу месц наглядаецца прыліў паасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у старыя колгасы.

В. С.

Опэрацыйная зводка з фронту падрыхтоўкі да вясны

Папярэднія весткі аб падрыхтоўцы да правядзеньня другой бальшавіцкай сяўбы гавораць, што рад організацый ня ўключыўся па баявому ў падрыхтоўку.

Згодна пляну, па БССР неабходна засыпаць насенфондаў 414 тыс. тон. На 10—1, па вестках з 85 раёнаў, засыпана толькі 44,384 тоны, альбо 10,7% заданьня. На 20—1 засыпана 48.385 тон— 11,7проц.

Неабходна да сяўбы адрамантаваць 664 трактары,—на 20 студзеня адрамантавана 82 трактары, ці 12,3% заданьня.

У БССР 4239 колгасаў, але-ж плян пасеўнай кампаніі даведзен толькі да 1948 колгасаў.

Рэалізацыя і ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсеКП(б) ад 20 студзеня аб разгортваньні вытворчае агітацыі і масавай работы вакол задач падрыхтоўкі да вясеньняй сяўбы праходзіць слаба.

Наркамзем абмежаваўся толькі пастаноўкай 15 дакладаў і гутарак на прадпрыемствах і настаўніцкіх конфэрэнцыях.

З 12—1 Наркамзем накіраваў у раёны 20 адказных працаўнікоў для кіраўніцтва падрыхтоўчай працай да вясеньняй сяўбы.

Загатоўка насеньня ідзе марудна. Ільнанасеньня трэ' было загатовіць 26.900 тон, загатоўлана 13.435,3 тоны (49,5 проц.), канапель—800 тон загатоўлена 403,6 тоны(50,5 проц.).

У 4239 колгасах БССР знаходзіцца 119.644 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. На 10 верасьня налічвалася 3145 колгасаў з 90.220 гаспадаркамі. За 5 апошніх месяцаў БССР колектывізавалася на 3,8 проц., у колгасы ўліліся 29.424 бядняцка-серадняцкіх гаспадаркі. Гэты процант прыросту вельмі мізэрны.

Уперадзе ідуць: Лепельскі раён—колектывізаваны на 37,8 проц., Клімавіцкі—32,5 проц., Жыткавіцкі, 31,1 проц., Камарынскі—28,8, проц., Хойніцкі—28,2, проц. Менскі прыгарадны сельсавет колектывізаваны на 50,9 проц., (па даных на 20 студзеня).

Плятуцца ў хвасьце: Гомельскі—колектывізаваны толькі на 6,8 проц., Церахаўскі—7,8 проц., Гарадоцкі—6,9 проц., Дубровенскі—8 проц., Бешанковіцкі—8,2 проц, Стара-Дарожскі—8.5 прпц.,

Гэтае становішча патрабуе рэзкога павароту ўсёй грамадзкасьці, і ў першаю чаргу партыйна-комсамольскіх організацый, тварам да падрыхтоўкі к вясьне, тварам да колектывізацыі.

Г. фрыд.

Падцягнуць адстаючыя вучасткі

Падрыхтоўку да другой бальшавіцкай вясны савгас „Вольная Праца“ распачаў месяц таму назад. Пляны пасеўкампаніі абгавораны на вытворчых нарадах і на сходах рабочых.

Савгас поўнасьцю забясьпечаны ўгнаеньнем. Рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтара ідзе шпаркім тэмпам.

Плошчу пад яравыя пасевы савгас пашырае сёлета да 305 га супроць леташніх 126 га Павялічваецца таксама плошча пад агароднінай з 80 га да 200 га. Аднак усё-ж у падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы савгас мае рад недахопаў.

Так да ачысткі насеньня савгас прыступіў толькі нядаўна. Ачыстка праходзіць зусім павольна, у савгасе мала цягавай сілы і не хапае насеньня для гародаў.

А. Заслаўскі.

Ленінскі прыліў даў у колгас „М. Горкага“ 30 новых колгасьнікаў

У сувязі з распрацоўкай пастановы аб'яднанага сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК Усе КП(б) і ленінскімі днямі, на агульным сходзе колгасьнікаў імя Максіма Горкага сумесна з працоўным сялянствам вёскі Домжарц Бягомельскага р-ну 30 аднаасобных бядняцка-серадняцкія гаспадарак запісаліся ў колгас імя Максіма Горкага.

Пост „Чыр. Зьмены“
Гец Міхась

МАЦАВАЦЬ КЛЯСАВАЕ ВЫХАВАНЬНЕ ТРЭЦЯГА ПАКАЛЕНЬНЯ

Даклад тав. Север'янавай „Аб рабоце сярод дзяцей“ на IX зьезьдзе УсеЛКСМ

Дзьве сыстэмы

Сусьветны экономічны крызіс у капіталістычных краінах з усёй сілай абрушыўся на дабрабыт працоўных: з кожным годам, з кожным месяцам колькасьць беспрацоўных едакоў у сям'і расьце. З ростам рэзэрвнай арміі працы стала ў надзвычайнай ступені ўзрастаць эксплёатацыя ўсіх пакаленьняў.

Капіталістыя, у пагоні за большай нажывай, уцягваюць дзяцей і жанчын у вытворчасьць.

Каля 10 мільёнаў дзяцей ва ўзросьце ад 7 да 15 год занята наёмнай працай у прамысловасьці, сельскай гаспадарцы і падсобных галінах: саматужныя промыслы, газэтчыкі, чысьцільшчыкі, пашталёны і інш.

У Злучаных Штатах каля 25 тыс. дзяцей працуе пад зямлёю ў шахтах. За год бывае 9—10 тысяч выпадкаў розных няшчасьцяў. Адзін мільён 400 тыс. дзяцей пазбаўлены магчымасьці наведваць школы.

Працоўнае законадаўства, якое існуе па ахове дзіцячай працы ў перадавых капіталістычных краінах, бязупынна і сыстэматычна парушаецца.

Зусім іншае становішча мы бачым у нашай краіне—у краіне будуючагася социялізму. Ужываньне працы дзяцей у народнай гаспадарцы, не навучальна-вытворчага характару, у нас забаронена не на словах, а на справе. Школа фабзавучу—важнейшае зьвяно ва ўсёй нашай сыстэме адукацыі—павінна будзе сёлета ўвабраць у сябе 700 тыс. падлеткаў і ў вогуле ахапіць 1 млн. 200 тыс. дзяцей.

Школа сялянскай моладзі ўжо падыходзіць да ахопу 300 тыс. вучняў.

Увядзеньне ўсеабучу, будаўніцтва фабзавучаў, сямігодак пры заводах і фабрыках падводзяць такую базу пад нашу соцыялістычную сыстэму адукацыі, што вытворчая праца дзяцей і падлеткаў, злучаная з навучаньнем, сконцэнтруе ў сябе тыя ўстаноўкі, якія далі асновапаложнікі марксызму—Маркс і Энгельс—школам у соцыялістычнай дзяржаве.

З поўным правам мы можам сказаць, што ў нашай краіне выхаваньню дзяцей аддаецца тая ўвага, якую яны заслугоўваюць.

Узамен каставых, абслугоўваючых розныя клясы школ, мы маем адзіную політэхнічную школу для ўсіх дзяцей. Замест двурушнага дэкрэту аб усеагульным абавязковым навучаньні, якім прыкрываюць у капіталістычных краінах жудасную эксплёатацыю дзяцей, мы зрабілі сапраўдныя крокі да поўнага ахопу ўсіх дзяцей пачатковымі школамі.

Калі ў 1929 г. мы мелі ў фабзавучы 163,3 тыс. вучняў, дык у 1930 г. мы ўжо маем 589,4 тыс. чалавек, а ў бягучым 1931 годзе гэтая колькасьць узрасьце да 1.204,1 тыс.

Пролетарская дзяржава надзвычайна добра разумее, што ўсе зброі культурнага ўзьдзейнічаньня на масы павінны быць пастаўлены на службу соцыялізму, і таму дзіцячая кніга, кіно і радыё адыгрываюць у нас агромністую ролю. Наша дзіцячая кніга на сусьветным рынку лічыцца лепшай па афармленьню. Не заўсёды можна тое-ж сказаць і пра яе якасьць. І кніга, і кіно, і радыё яшчэ вельмі павольна перабудоўваюцца ў адпаведнасьці з растучымі да іх патрабаваньнямі рэконструкцыйнага пэрыоду.

Уся наша работа, усё наша выхаваньне базіруюцца на адмаўленьні боскае сілы, на адмаўленьні боганькі і богашуканьня, на актыўна-антырэлігійным выхаваньні. Вось такія нашы прынцыпы соцыялістычнага выхаваньня.

Шырокі рэволюцыйны ўздым у краінах капіталу выклікае зараз бурны рост палітычнай актыўнасьці дзяцей. У Нямеччыне нядаўна прашлі школьныя забастоўкі, якія набылі вялікі політычны характар. У Амэрыцы і Кітаі 15-гадовыя хлопцы зьяўляюцца застрэльшчыкамі забастовак. У цэлым шэрагу краін піонэры працуюць у падпольлі.

Трэба проста сказаць, што рост політычнай актыўнасьці дзяцей за мяжою не знаходзіць свайго дастатковага замацаваньня ў піонэрорганізацыі. У Англіі і Францыі колькасьць піонэраў скарацілася амаль удвая. Дзіцячая організацыя за мяжою перажывае крызіс.

Перад піонэррухам СССР стаіць задача значна ўзмацніць сваю ўвагу, сваю дапамогу і свае клопаты аб піонэрах, якія знаходзяцца за пагранічнай паласою.

У нашай краіне ёсьць адзіная масавая організацыя, якая ахоплівае 4.000.000 дзяцей. Гэта—організацыя юных піонэраў.

Мы выхоўваем дзяцей не на законах падпарадкаваньня ваўком і бацьком беспярэчаньня, а на конкрэтным удзеле ў будаўніцтве, на барацьбе за соцыялізм. І ў гэтым мы бачым адзінства мэты ўсіх трох пакаленьняў пролетарыяту і піонэраў, комсамолу і партыі.

Абмяжуюся агульным вывадам, супастаўленьнем вынікаў дзьвюх сыстэм выхаваньня: клясава-буржуазнай і клясава-пролетарскай.

Скаутызм, усе буржуазныя організацыі дзяцей—непадзельная частка буржуазнай дзяржавы па ўмацаваньню капіталізму, па падняволеньню працоўных.

Піонэрорганізацыя—буйнейшае зьвяно ў агульнай сыстэме пролетарскіх організацый краіны саветаў.

Новая мараль і яе значэньне ў справе комуністычнага выхаваньня дзяцей

Таварышы, на базе новых грамадзкіх адносін мы ўтвараем новую, комуністычную мараль, уласьцівую толькі клясе пролетарыяту. Уладзімер Ільліч на III зьезьдзе комсамолу гаварыў:

„Усякую такую моральнасьць, узятую з пазачалавечага, пазаклясавага разуменьня, мы адмаўляем. Мы гаворым, што гэта ашуканства, што гэта надувацельства і забіваньне галоў рабочых і сялян у інтарэсах абшарнікаў і капіталістых.

Мы гаворым, што наша моральнасьць падпарадкавана ўпаўне інтарэсам клясав й барацьбы пролетарыяту. Наша моральнасьць выводзіцца з інтарэсаў клясавай барацьбы пролетарыяту“ (Ленін).

Мы зьнішчылі фэтыш сям'і ў тым сэнсе, што самым высокім для ўсіх пакаленьняў зрабілі справу клясы, інтарэсы клясы, барацьбу пролетарыяту. У нас няма той вастрыні проблемы бацькоў і дзяцей, якая была ўласьціва фэўдальнай і буржуазнай грамадзе.

Барацьба дзіцячых організацый за гонар заводу, за выкананьне прамфінпляну, заключэньне соцумовы з бацькамі выцякае з зусім іншага становішча дзяцей у пролетарскай дзяржаве чым у грамадзе капіталістычнай, і зусім іншага становішча дзяцей у сям'і.

Мы зьнішчылі фэтыш сям'і ў тым сэнсе, што навучылі дзяцей выходзіць з больш высокіх інтарэсаў—з інтарэсаў клясы пролетарыяту.

Організаваць такую сыстэму выхаваньня, якая спрыяла-б выяўленьню ўсіх сіл у нашай грамадзе, якая забясьпечыла-б прасоўваньне лепшых, работу на грамаду работу на сваю клясу,—вось асноўная мараль нашага комуністычнага выхаваньня.

Організуючы дзяцей на барацьбу за прамфінплян, за політэхнізм, за ўсеабуч, мы абавязаны паказваць ім пэрспэктывы разгорнутай соцыялістычнай грамады, пэрспэктывы ўтварэньня новых прадпрыемстваў, электрофікацыі і хэмізацыі краіны.

Мобілізуючы дзяцей на барацьбу супроць бяскультур'я, бруду і няпісьменнасьці, мы разам з тым паказваем ім пэрспэктыву сусьветнай рэволюцыі, рух рэволюцыйных мас у Кітаі, Індыі, Нямеччыне.

Мы насаджаем ва ўсім партыйнасьць поглядаў і пачуцьцяў. Мы выступаем на барацьбу супроць усіх дробнабуржуазных перажыткаў, супроць усяго, што капіталістычна калечыць моладзь. Дробным канарэйкавым пачуцьцям, якія апяваюцца буржуазнымі пісьменьнікамі і поэтамі і процістаўляюцца імі звычайна інтарэсам грамадзкім, інтарэсам клясавым, мы можам супроць паставіць пачуцьцё, непамерна больш высокае—пачуцьцё гаспадара-будаўніка новага жыцьця, пачуцьцё грамадзяніна сьвету, інтэрнацыяналістага. У гэтым нашым выхаваньні ёсьць і пьвяпрозасьць, і шалёны пал, і каханьне, і ненавісьць, і гордасьць, і слава, і мары. У аснове ўсіх гэтых пачуцьцяў—інтарэсы клясы, барацьбы пролетарыяту. Гэта наша асноўная мараль.

Дзесяць год аддзяляюць нас ад III зьезду комсамолу. Дзесяць год назад Ленін выступаў з прамоваю аб задачах саюзу моладзі.

У гэтай прамове Ленін сказаў:

„Наша выхаваньне трэба злучыць з барацьбою працоўных супроць эксплёататараў, для таго каб дапамагаць першым вырашаць тыя задачы, якія з вучэньня комунізму выцякаюць...

Мы хочам Расію з краіны жабрацкай і ўбогай ператварыць у краіну багатую. І трэба, каб саюз комуністычнай моладзі сваю адукацыю, свае навучаньне і свае выхаваньне злучыў з працай рабочых і сялян, каб ён не замыкаўся ў свае школы і не абмяжоўваўся толькі чыткаю комуністычных кніг і брошур.

Толькі ў працы разам з рабочымі і сялянамі можна стаць сапраўднымі комуністымі“.

Гэта прамова Леніна зьяўляецца па сутнасьці фундамэнтам нашай марксыцкай пэдагогікі, яна зьяўляецца крыніцай для вырашэньня пытаньняў сыстэмы народнай адукацыі нашай краіны, і пытаньняў мэтодыкі выхаваўчай работы з дзяцьмі.

Усяго толькі 2–3 гады назад адбываліся жорсткія спрэчкі і дыскусіі на піонэрскія тэмы. Было аб чым спрачацца. Піонэрская організацыя перажывала паласу цяжкіх затрудненьняў. У пошуках выхаду з гэтых цяжкасьцяй атрады імкнуліся шырока разьвіць культурную работу ўсякага роду: ранішнікі, вячэрнікі, пераплётныя, шавецкія майстэрні. Былі вынесены рашэньні аб прапрацоўцы кола звычак і ведаў, г. зн. програма піонэрскай работы.

Усё гэтае кола звычак і ведаў, усе гэтыя спробы ўтварэньня новай сыстэмы будаваліся на хісткім фундаманце старога зьместу. Прыдумваліся формы і мэтоды работы, уласьцівыя аднаўленчаму пэрыоду, тады як у дзьверы піонэрскай організацыі ўжо стукаўся рэконструкцыйны пэрыод і мы дзеля гэтага бачылі як рэконструкцыйны пэрыод ламаў і зьмест, і формы, і мэтады піонэрскай работы.

У жніўні мінулага году быў праведзен першы зьлёт піонэраў. Ужо на першым зьлёце піонэры рапартавалі аб сваіх шматлікіх перамогах. Яны давялі ўсяму сьвету, што дзеці савецкай краіны зьяўляюцца ня толькі заўтрашнімі, але і сёньнешнімі будаўнікамі соцыялізму.

Пасьля 1-га зьлёту і 6-й конфэрэнцыі комсамолу пачаўся другі этап у разьвіцьці грамадзкай работы дзяцей. Піонэрскія організацыі перайшлі на больш высокую ступень. Ад разноскі позваў, ад расклейкі плякатаў у перавыбарчую кампанію саветаў, яны перайшлі да разгорнутага ўдзелу ў барацьбе за індустрыялізацыю і колектывізацыю сельскай гаспадаркі.

Піонэры ўжо зьяўляюцца ня толькі заўтрашнімі, але і сёньнешнімі будаўнікамі соцыялізму. Лепшым пацьвярджэньнем гэтага могуць паслужыць водгукі саміх рабочых і грамадзкіх організацый аб нашых піонэрах.

Нядаўна ў „Ленінскіх Іскрах“ была зьмешчана наступная заметка:

„Усесаюзнаму старасьце—старшыні ЦВК СССР М. І. Калініну.

Пастанова агульна-гарадзкога зьлёту дзяцей і школьнікаў.

Базе імя Карла Маркса—ордэн працоўнага сьцягу.

Піонэры Ленінграду ў адказ на заклік партыі ўдарнай работай дапамаглі заводам і фабрыкам выканаць прамфінплян другога году.

Лепшая база, якая па-ўдарнаму дапамагла перавыканаць прамфінплян,—гэта база пры заводзе імя Карла Маркса. Піонэры, як і рабочыя заводу імя Карла Маркса былі ў перадавых шэрагах у барацьбе за пяцігодку.

Агульна-гарадзкі зьлёт баз і школ далучаецца да просьбы рабочых заводу імя Карла Маркса аб узнагародзе базы імя Карла Маркса ордэнам працоўнага Чырвонага сьцягу.

Барацьба за прамфінплян заводу становіцца самай блізкай справай для любога піонэра і школьніка.

На вёсцы піонэрорганізацыі прыймалі актыўнейшы ўдзел літаральна ва ўсіх мерапрыемствах, якія праводзіліся партыяй і комсамолам. Піонэры зьявіліся актыўнымі ўдзельнікамі тых жорсткіх клясавых сутычак, якія суправаджалі і суправаджаюць бурныя тэмпы колектывізацыі і соцыялістычнага наступленьня пролетарыяту. Большасьць нашых атрадаў на вёсцы праявіла стойкасьць і сьвядомасьць у гэтых баёх.

І ў горадзе, і на вёсцы за апошнія год-паўтара піонэрорганізацыя разгарнула соцыялістычнае спаборніцтва.

Соцыялістычнае спаборніцтва — гэта ня простае мэханічнае перанясеньне мэтодаў работы дарослых організацый у дзіцячае асяродзьдзе. Соцыялістычнае спаборніцтва—гэта лепшы пэдагогічны прынцып нашай работы, гэта прынцып выхаваньня колектывістых, гэта прынцып грамадзкага буксіру ў дапамогу адстаючым.

Мы не прызнаем адцягнутых размоў аб выхаваньні новага чалавека.

Мы зьяўляемся абаронцамі Марксавай формулы аб тым, што „пролетарыят перабудоўвае сябе ў процэсе барацьбы“.

Піонэррух выхоўвае з сваіх шэрагаў новых людзей у процэсе свайго актыўнага ўдзелу ў агульнай барацьбе партыі і комсамолу.

Адрозьненьне нашага марксыцкага выхаваньня якраз у тым, што інтарэсы соцыялістычнага будаўніцтва цалкам супадаюць з інтарэсамі і запатрабаваньнямі саміх дзяцей і ў іх гармонічным злучэньні закладзены ўсе магчымасьці выхаваньня новых людзей.

Пры аналізе становішча піонэрруху напрашваюцца наступныя два пытаньні:

1. Ці стаў новы зьмест работы здабыткам усіх атрадаў, г. зн. ці ўсе атрады ўключыліся ў барацьбу на розных вучастках соцыялістычнага будаўніцтва і 2. Ці ўцягнута ў гэтую работу маса піонэраў і неорганізаваных дзяцей. Тут трэба проста сказаць, што мы маем яшчэ вялікую колькасьць атрадаў, якія стаяць у баку ад штодзённага жыцьця сваіх прадпрыемстваў і дзейнасьць якіх падчас зводзіцца к паасобным кампаніям: сёньня ўвесь атрад кінуты на перавыбары саветаў, заўтра ўсе займаюцца вучотам прагульшчыкаў, пасьлязаўтра нічога ня робяць і г. д. Няма яшчэ ў масе атрадаў і зьвеньняў штодзённага і сыстэматычнага ўдзелу ў жыцьці заводу, колгасу, савгасу. Гэтая небясьпека дзяляцтва, небясьпека няўменьня зьвязваць будзённыя справы ўсяго атраду і паасобных дзяцей з агульнымі задачамі пабудовы соцыялізму ў нашай краіне прымае надзвычайна пагражаючы характар.

Кожны наш недахоп вырастае перашкодай на шляху барацьбы за дзетвару; кожны наш недахоп лье ваду на млын клясавага ворага. Змагацца з недахопамі, змагацца за чыстату клясавай лініі піонэр організацыі павінен заклікаць IX зьезд комсамольскую і піонэрскую організацыі.

Рост, якасьць, кіраўніцтва

Шырокі рост політычнай актыўнасьці дзяцей ставіў перад намі неабходнасьць організацыйнага змацаваньня гэтай актыўнасьці, неабходнасьць прыкметнага павялічэньня піонэр організацыі.

Выходзячы з гэтага, УІ конфэрэнцыя саюзу вынесла рашэньне аб павялічэньні ў два разы колькасьці піонэраў. Сёньня я павінна вам паведаміць, што рашэньне УІ конфэрэнцыі саюзу намі выканана.

На 1 студзеня 1928 году было 24.500 атрадаў і 1.682.000 піонэраў, на 1 студзеня 1929 году мы мелі 47,180 атрадаў і 1.792.000 піонэраў, на 1 студзеня 1930 году мы мелі 63.900 атрадаў і 2.476.000 піонэраў, на 1 ліпеня 1930 году мы ўжо маем 82.700 атрадаў і 3.223.000 піонэраў, а разам з акцябрэтамі мы ядпаем зараз 4-хмільёную армію дзяцей працоўных.

Соцыяльны склад піонэрорганізацыі па даных выбарачнага абсьледваньня на 1 сьнежня 1930 году наступны: дзяцей рабочых—32,4 проц., дзяцей батракоў—0,8 проц. (як бачыце, процант вельмі маленькі), дзяцей колгасьнікаў—22,1 проц. дзяцей аднаасобнікаў—26,8 проц., дзяцей служачых—12,6 проц., іншых бацькоў—5,3 проц., (параўнаць з данымі к УІІІ зьезду).

Мы маем зараз у піонэрорганізацыі хлапчукоў 50,3 проц., дзяўчынак—49,7 проц., г. зн. амаль палову.

Я лічу неабходным асабліва зьвярнуць увагу IX зьезду на пытаньне аб комсамольскім ядры ў піонэрорганізацыі.

У момант УІІІ зьезду процант піонэраў-комсамольцаў даходзіў да 8 пр. Зараз-жа комсамольскае ядро зьменшылася да 3,4 проц., з якіх фабрычна-заводзкія атрады—5,5 проц., гарадзкія атрады—3,1 проц., колгасныя і савгасныя 2,1, у вёсках—2,4 проц.

Мы павінны задачу росту самай піонэрорганізацыі ў 3-м годзе пяцігодкі паставіць у непасрэдную сувязь з задачай разгортваньня політычнай актыўнасьці дзяцей.

Трэба ўтварыць атрады пры ўсіх колгасных ячэйках, трэба колькасьць піонэраў у бліжэйшыя гады давесьці хаця-б да 10 мільёнаў.

Задача росту піонэрорганізацый яшчэ больш завастрае неабходнасьць якаснага павышэньня ўсёй нашай работы. 3-ці год пяцігодкі будзе годам барацьбы за якасныя паказчыкі ў нашай прамысловасьці.

Такім чынам, барацьба за вытворчую працу дзяцей ёсьць барацьба за якасьць выхаваўчай работы з імі.

Гэтая барацьба павінна, па-другое, найсьці па лініі ўпрамленьня дзецьмі ўсёй праводзімай імі работы. Недапушчальна такое становішча, калі павадыр прапануе дзецям правесьці якую-небудзь работу, зусім не растлумачыўшы ім ні сэнсу, ні значэньня яе.

Піонэры не мэханічныя выканаўцы, яны павінны быць гаспадарамі сваёй работы.

Барацьба за якасьць піонэрскай работы павінна, па-трэцяе, пайсьці па лініі прасякненьня яе жывымі цікавымі момэнтамі.

Змагацца за якасьць піонэрработы значыцца раней за ўсё змагацца за клясавую завостранасьць і клясавую лінію піонэрорганізацыі.

Але нам, бязумоўна, не дасягнуць ніякіх рашаючых посьпехаў у барацьбе за якасьць піонэрпрацы, калі ня будзе забясьпечаны рэзкі паварот ува ўсім кіраўніцтве саюзу піонэррухам.

Кіраўніцтва дзіцячым камуністычным рухам (ажыцьцяўляецца, у нас па трох лініях: 1) забясьпечаньне піонэрруху кадрамі комсамольцаў павадыроў і сыстэматычнага кіраўніцтва атрадамі з боку камітэтаў, ячэек УсеЛКСМ. 2) Разьвіцьцё дзіцячай самадзейнасьці і прыцягненьне саміх дзяцей да кіраўніцтва рухам. 3) Прыцягненьне шырокай грамадзкасьці і кваліфікаваных сіл на дапамогу атрадам і зьвеньням.

Галоўная бяда ў кіраўніцтве саюзу піонэррухам зьяўляецца ў тым, што нашы ячэйкі і камітэты не навучыліся ўцягваць дзяцей у сваю агульную працу, не навучыліся сумеснай працы піонэраў і комсамольцаў перабудоўваць свае кіраўніцтва—а ў гэтым-жа перш за ўсё ляжыць ключ да вырашэньня нахварэўшых пытаньняў кіраўніцтва. Мы яшчэ ня выжылі ў саюзе недаацэнкі піонэрруху, як аднаго з важнейшых зьвеньняў агульна-пролетарскага руху.

Пэрыод соцыялізму і асноўныя задачы піонэрорганізацыі

К IX зьезду піонэрорганізацыя прыйшла з вялікімі дасягненьнямі на розных фронтах соцыялістычнага будаўніцтва. Гэтыя дасягненьні зьяўляюцца толькі пляцдармам, ад якога трэба адштурхнуцца для далейшага разгорнутага ўцягненьня мільённай масы дзетвары ў дапамогу партыі і саюзу.

Прамфінплян трэцяга году пяцігодкі, прамфінплян заводу, фабрыкі, савгасу, колгасу—вось плян баявых дзеяньняў любога атраду і зьвяна.

Разам з дарослымі рабочымі—на барацьбу з прарывамі, разам з дарослымі рабочымі і колгасьнікамі—на барацьбу за высокія тэмпы, за павышэньне вытворчасьці працы; разам з дарослымі рабочымі і колгасьнікамі—на барацьбу за якасьць продукцыі, за рацыяналізацыю, за зьніжэньне сабекошту; на барацьбу за новыя формы соцыялістычнай працы, за сустрэчны прамфінплян, за грамадзкі буксір, за соцспаборніцтва і ўдарніцтва,—вось генэральная лінія нашай піонэрорганізацыі.

Трэба ў аснову работ кожнага вясковага атраду пакласьці выкананьне гэтага дагавору, мобілізаваць ня толькі піонэраў, але і ўсю масу дзетвары.

Зараз барацьба за політэхнічную школу атрымала ўжо даволі шырокі размах, але рэальных вынікаў мы бачым вельмі мала. Тут мы ўпіраемся перш за ўсё ў сьцяну раўнадушша тупых бюрократычных адносін многіх гаспадарнікаў і заўзятых адміністратараў. Дзьверы фабрык і заводаў у масе сваёй яшчэ замкнуты для дзяцей.

Трэба змагацца за правільную організацыю дзіцячай працы ў колгасах за такую працу, якая выхавала-б колектывістых за працу, якая зьяўляецца „справай славы, справа мужнасьці і геройства“.

Барацьба за вытворчую працу дзяцей, за ўкараненьне тэхнікі ў дзіцячае асяродак ёсьць барацьба за новую політэхнічную школу. Сёньня ня час для агульных дэклярацый аб задачах політэхнічнай школы.

Той, хто недаацэньвае політэхнічную школу як крыніцу падрыхтоўкі новых кадраў, той самы махровы опортуністы, той ня бачыць заўтрашняга дня, ня бачыць заўтрашніх патрабаваньняў у кваліфікаванай рабочай сіле.

Завод павінен стаць цэнтрам выхаваўчай работы з дзецьмі, таму мы лічым магчымым зараз на базе заводу організаваць перакомплектаваньне школ і атрадаў з тым, каб піонэры аднаго атраду займаліся ў аднэй школе.

Барацьба за ўсеабуч сустракае на сваім шляху агромністыя перашкоды: недахоп памяшканьня, адсутнасьць пэдагагічных кадраў, а галоўнае матар'яльнае незабясьпячэньне дзяцей працоўных. Комсамол і піонэрскія організацыі абавязаны гэтыя перашкоды перамагчы.

У галіне нацыянальнага культурнага будаўніцтва наша задача заключаецца ў тым, каб садзейнічаць шырокаму росквіту нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зьместу культуры, садзейнічаць правядзеньню выхаваньня, адукацыі ў прыватнасьці ўсеабуча на роднай мове, садзейнічаць у барацьбе за ўтварэньне і прасоўваньне ў масы нацыянальнай культуры і, нарэшце, асабліва садзейнічаць барацьбе супроць старых бытавых традыцый за соцыялістычную перабудову быту. Гэтыя задачы зьяўляюцца разам з тым задачамі ўсёй нашай піонэрорганізацыі. Яны павінны стаць базай для разьвіцьця інтэрнацыянальнага выхаваньня.

Мы павінны ўкядрыць у сьвядомасьць піонэраў пачуцьцё інтэрнацыянальнай солідарнасьці, сьвядомасьць таго, што яны зьяўляюцца толькі часткай агульнай інтэрнацыянальнай арміі.

Сёньнешнія піонэры, сёньнешнія дзеці Краіны Саветаў—заўтра актыўныя ўдзельнікі гэтых баёў. Ад нас залежыць, каб гэтыя ўдзельнікі горда і мужна несьлі сьцяг Леніна, каб яны з гэтым сьцягам змагаліся і перамагалі за справу соцыялізму, за справу Леніна (бурныя аплёдысмэнты).

(Даклад тав. Север'янавай падаецца ў скарочаным выглядзе).

КОМСАМОЛ, НА РЫШТАВАНЬНІ!

АУЛАДАЦЬ ВЫШЫНЯМІ КАПІТАЛЬНАГА БУДАЎНІЦТВА

ПАДРЫХТОЎКА ДА БУДАЎНІЧАГА СЭЗОНУ ТРэЦЯГА РАШАЮЧАГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ ПРАХОДЗІЦЬ НАДЗВЫЧАЙНА МАРУДНЫМІ ТЭМПАМІ

ЗА ВЫТВОРЧЫЯ МАНЭЎРЫ НА БУДАЎНІЦТВЕ, ЗА ПЛЯНАВАНЬНЕ, ЗА БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ —БАЛЬШАВІЦКАМУ РАШАЮЧАМУ ГОДУ!

Не будаваць па-кояў без дзьвярэй

Комсамол з будаўніцтва павінен узяць шэфства над падрыхтоўкай да сэзону 3-га году

Пытаньне пасьпяховага выканьня будфінпляну ў значнай частцы вырашаецца яшчэ да пачатку будаўніцтва, у значнай частцы залежыць ад падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону. На гэтым вучастку мы маем значную пагрозу зрыву.

Наволыніцкія тэмпы працы, бяссыстэмнасьць і опортунізм прывялі да зрыву будаўнічых прац у 1930 г., паклалі свой адбітак на падрыхтоўку да будсэзону 3-га году пяцігодкі. Урокі прарыву нічаму не навучылі бюрократаў з кіраўніцтва.

Стары сьпеў на новы лад

„Буйнешая пабудова Дому ўраду знаходзіцца ў крытычным становішчы. Яна не забясьпечана патрэбнымі матар'яламі і чарцяжамі"—пісала „Чырвоная Зьмена" яшчэ ў мінулым годзе. Летась дом ураду пачыналі будаваць маючы чарцяжы шостага паверху і ня было чарцяжоў падвальнага і першага паверхаў.

Значныя пераробкі ў выніку бясплянавасьці і непадрыхтаванасьці да працы, у выніку злачынных адносін да запатрабаваньняў пляну будоўлі, зрабіліся сыстэматычнай зьявай і вялікім цяжарам клаліся на сабекошт і тэмпы будовы. Будавалі пакоі без дзьвярэй, каб пасьля „будаваць дзьверы" ці інакш кажучы, ламаць, псаваць матар'ял.

А як сеньня?

Мендзяржбуд дагэтуль ня ведае, што ён будзе будаваць, об'екты ня вызначаны. Гэта фактычна зрывае ўсю практычную працу да сэзону, не дае магчымасьці ўзяцца за выкананьне тэхнічных чарцяжоў, а таму, калі зараз ня прыняць тэрміновых захадаў, ствараецца пагроза, што ў наступным сэзоне прыступім да будоўлі бяз поўнай падрыхтоўкі і зноў будзем „будаваць дзьверы". Зноў будзем псаваць каштоўны, дэфэцытны будматар'ял.

Бясплянавасьць у плянаваньні

Арматурныя працы па Дому Ўраду не вытвараюцца з прычыны адсутнасьці чарцяжоў. Прапанаваны чатыры варыянты міжпавярховых перакрыцьцяў, але дагэтуль яшчэ ніводны з іх ня прыняты. А часу было шмат. На пабудове ёсьць жалеза, ёсьць і рабочая сіла. Ударная брыгада арматуршчыкаў займалася... адкіданьнем сьнегу—ня было працы. А на пабудове Дому Друку ўжо скончаны чарцяжы, але з-за адсутнасьці жалеза праца таксама не вытвараецца.

Вось яскравы факт зрыву працы. Яшчэ дагэтуль не зведзены пляцы для пабудоў, што не дае мажлівасьці выкарыстаць для падвозу будматар'ялаў зімовыя шляхі.

Будаўнічы комсамол павінен узяць на буксір справу падрыхтоўкі да будсэзону 3-га году пяцігодкі. Кожнай пабудове — комсамольскі Дзяржплян. Комсамольскому Дзяржпляну пабудовы баявое заданьне— уключыцца ў справу падрыхтоўкі да будсэзону, конкрэтным удзелам комсамолу, дасягнуць зруху.

Добрай падрыхтоўкай да сэзону абвесьцім барацьбу стратам на будаўніцтве.

А. С.

Ч А М У ?

... Яна добра ведае іх хітрыкі. Нагінаецца яшчэ ніжэй. Стружкі казытаюць нос, шчокі... Рукі глыбей убіраюцца ў стружкі, мацней сьціскаюць, каб болей узяць. Калі стан выпрастоўваецца і стружкі, моцна сьціснутыя грудзьмі і рукамі, ідуць па калідоры, яе твар робіцца сумным, задумёным.

— Чаму так лёгка? Няўжо мала ўзяла? Як пустэчу нясу.

Яна моцна сьціскала рукі, а сьціснуўшы бярэцца рукой за руку, яшчэ мацней цісьне і цісьне.

— А лёгка, зусім лёгка, нібы пустэча.— Стружкі ёй ня пахнуць і ня колюцца, калі яны цьвёрдымі канцамі датыкаюцца да агрубелых прыгожых рук, яны хрусьцяць і зварочваюцца ў кольцы, тады іх робіцца мала-мала.

Стружкі ня пахнуць і сваім пахам не перашкаджаюць думаць доўга—доўга. Штодзень думаць аб адным.

— Чаму так? Чаму стружкі лёгкія, нібы так ходзіш?

І тады твар робіцца сумным, задумным. Цяжка пазнаць чаму. Але я ведаю... Калі яна расказвала, што хоча быць столярам. яе твар быў такі самы. Цяпер ён нібы пытаецца:

— А чаму, чаму мне нельга, каб столярам?

Прытуліўшыся да гары стружак, яна ўздымае голаву і глядзіць на варштат, дзе бягуць стрыгучыя гэблі па дрэве. Тады яна бярэцца рукой за руку, як гэбель бяруць. Моцна, моцна цісьне.

— Ці здужаю? Каб гэблем так...

Калі блізка чуецца ў паветры хваля гудка, яна падыходзіць да варштата, дзе столяр Бабрынін, што ў комсамольскім бюро.

— Сёньня можна?

— Але. Спрытныя сталярскія рукі паказваюць як трэба працаваць. Гудок выпіхнуў людзей у сталоўку. На яе твары палымнела ўхмылка радасьці.

— Але чаму толькі ў абед? Чаму ня ўвесь дзень, каб столярам?—Бабрынін даўно казаў:

— Вучыць буду, добрыя дзяўчаты; а галоўнае з ахвотай бяруцца, хутка і навучацца.


Пытаеце, як зваць іх? Іх некалькі ў майстэрні Мендзяржбудаб'яднаньня: Радкевіч, Маліноўская, Пяршон. Некалькі год у майстэрнях працуюць. Усё стружкі носяць...

Чаму ня столярам, калі моцна, па-комсамольску хочаш?

Загадчык абяцаў...

Чаму ў стружках цьвіце 18 гадоў узрост комсамольскі. Чаму?—пытаю я ў комсамольскага бюро. Адкажэце!

А. Сокал



„Сам ня гам і другому ня дам"...

Сустрэць сэзон падрыхтаванымі

Своечасовая падвозка будаўнічых матар'ялаў на месцы пабудоў мае вялікае значэньне. Надзвычайна часта паасобныя прарабы, кіраўнікі кантор і пабудоў адносяцца да гэтай справы па-дзяляцку, выходзячы з сваіх вузка-ведамсьцьвенных інтарэсаў. Кожны прараб зацікаўлены ў хутчэйшым сканчэньні будаўніцтва свайго об'екту. імкнецца працягнуць на сваю пабудову найбольшую колькасьць будаўнічых матар'ялаў. І выходзіць, што на адных пабудовах вялікія залежы, а на іншых будаўніцтва затрымліваецца.

Ня лепш пастаўлена справа з рабочай сілай. І тут мы сустракаем аналёгічныя факты. У той час, калі паасобныя пабудовы спыняюць сваю працу з-за нехапу рабочых рук, занадта „клапатлівыя" прарабы затрымліваюць рабочых на сваёй пабудове-даюць ім непатрэбную працу, абы мець рэзэрв рабочай сілы.

Слабое разгортваньне соц. спаборніцтва і ўдарніцтва, адсутнасьць усякай выхаваўчай працы сярод сэзонных рабочых—вынік слабога павароту грамадзкіх організацый тварам да будаўніцтва. У падрыхтоўцы да новага будаўнічага сэзону патрэбны карэнны перелом, якога яшчэ дагэтуль няма.

Сэзон 1931 году трэба сустрэць падрыхтаванымі. Усе будаўнічыя пляны, чарцяжы і будфінпляны павінны быць складзены да пачатку новага будаўнічага сэзону, павінны быць ліквідаваны ўсе прарывы на цагельных заводах і сталярных майстэрнях.

Неабходна да пачатку будаўнічага сэзону па ўсім будаўніцтве абвясьціць вытворчыя манэўры. Падрыхтоўку да гэтых манэраў трэба распачаць зараз-жа, дзеля чаго выпрацаваць конкрэтны плян падрыхтоўкі, а таксама і правядзеньня гэтых манэўраў.

Да манэўраў трэба будзе прыцягнуць усе ўстановы, што рыхтуюць кадры для будаўніцтва, у першую чаргу—будвучы, якія выпушчаюць другі курс якраз у пачатку будаўнічага сэзону.

Гэтыя манэўры павінны паслужыць штуршком для далейшай напружанай працы ўсіх грамадзкіх організацый у справе палепшаньня выхаваўчай працы сярод сэзоньнікаў.

Неабходна будзе стварыць пры ўсіх буйных пабудовах штабы для кіраўніцтва манэўрамі. Штабы возьмуць на сябе нагляд і ўсю працу па барацьбе за найлепшую падрыхтоўку і правядзеньне будаўнічага сэзону.

У час манэўраў павінны будуць адбыцца гарадзкія конфэрэнцыі ўдарнікаў будаўнікоў, якія будуць праверыць стан будаўніцтва і намячаць далейшыя мерапрыемствы, каб як найлепей правесьці будаўнічы сэзон.

Манэўры павінны паслужыць штуршком у далейшай працы комсамолу на будаўніцтве, у барацьбе за плянавасьць, якой да гэтага часу ня было.

Уся грамадзкасьць павінна зацікавіцца гэтай справай і падрыхтоўку да будаўнічага сэзону 1931 году ператварыць ва ўдарную падрыхтоўку да будаўнічых манэраў.

Правядзем усебеларускія манэўры па падрыхтоўцы да будаўнічага сэзону!

Самакрытыкоўскі

Па эклектыках і шовіністых у музыцы—руйнуючы ўдар

Зараз пераходзім да другога музычнага дыктатара, які ўдасканальвае тэорыю Дрэйзіна аб бяскласавасьці музыкі. „У музыцы няма ні ідэолёгіі, ні клясавага зьместу"—гэта формула музычнага „Апо ена"—Пятрова.

Як прыклад бяз'ідэйнасьці і бяскласавасьці, ён прыводзіць Баха. Калі-б гэтая думка была думкай уласнай пэрсоны Пятрова, альбо Дрэйзіна, дык непатрэбна было-б займаць месца ў газэце. Гэтай бацылай заражаны ня толькі былыя вучні імпэратарскіх консэрваторый (цяпер настаўнікі), але і вучні (нават комсамольцы) савецкіх музычных устаноў.

Куды вядзе нас такі погляд? Разважаць, ці ёсьць у музыцы сьляды ідэолёгіі і ці іх няма ня будзем, бо далёка... бяздоваднае яшчэ нікому непашэнціла, ня ўдасца і Пятрову пажаць лаўры на гэтым шляху. У нашым разважаньні будзем выходзіць ад супраціўных Пятрову поглядаў.

Марксысты пад зьместам музыкі разумеюць клясавую псыхо-ідэолёгічную накіраванасьць музычнай рэчы, адпаведна організаваную пры дапамозе сыстэмы гукавых вобразаў. У клясавай грамадзе заўсёды будзе кляса. Раз так, дык нельга паказаць композыцыю рэчы бяз ідэі зьместу, як нельга пабачыць Пятрова без яго фізычнага абліччча. Зьмест і форма адзіная. Пятроў і К-о насыпаюць славесны брусьвер аб бяз'ідэйнасьці музыкі дзеля таго, каб абяззброіць пролетарыят у галіне музыкі і ўзброіць яго праціўніка.

Клясавасьць і ідэйнасьць у музыцы пакажам на тым-жа Баху.

Дзейнасьць Баха выпадае на 18 стагодзьдзе. Вядома, што ў гэты час адна грамадзкая формацыя зыходзіла з гістарычнай сцэны (глядзі вышэй аб романтызьме), а другая, новая формацыя. узыходзіла на гэтую сцэну. Характэрнасьць гэтага пэрыоду ў тым. што стары саперпік мае моц для супраціўленьня, а новы яшчэ не настолькі моцны, каб адным ударам мог выбіць конкурэнта з гістарычнага сядла. Людовік 14, карыстаючыся такім становішчам, мае рацыю гаварыць: „Дзяржава — гэта я". У грамадзкім жыцьці заставаліся старыя заставы, якія напаўняліся струменямі сьвежай вады. Зьмест новае плыні, якая сачылася праз старыя заставы, быў буржуазным. Буржуазія патрабавала „ордэр на жыцьцё". Яна— „соль зямлі"—упэўненая ў сваёй сіле, гэроічна і рашуча, з бадзёрасьцю і радасьцю, як музыкі кажуць—мажорнасьцю, ішла на змаганьне з праціўнікам. Мажорнасьць часу знайшла сваё ўвасабленьне ў вобразах музычных гукаў. Пачынаецца музычны рэнэсанс. На музычным Парнасе зьяўляюцца такія багі тагочаснай музыкі, як Бах, Гайдна, Моцарт, Бэдговэн і інш.

Чым-жа тлумачыцца тое, што музычны рэнэсанс спазьніўся, адстаў ад жывапісу, скульптуры, літаратуры і іншых відаў мастацтва на паўтара-два стагодзьдзі?

Музычныя рэчы выконваюцца інструмантамі (оркэстровыя, сольныя) пад час вельмі складанымі. Тэхвічнае ўдасканаленьне інструмантаў залежыць непасрэдна ад становішча вытворчых сіл. Вытворчыя сілы ў эпоху дзейнасьці Рафаэля, Леанардо-да-Вінчы. Эразма Ротэрдамскага і Рабле (XV і XVI стагодзьдзе) былі непараўнана ніжэй, чым у эпоху Сэбастыяна Баха (1685-1750 г.) Гэтым і тлумачыцца тая акалічнасьць, што музычны рэнэсанс быў у часе адарваны ад іншых відаў мастацтва. Становішча вытворчых сіл у гэтую пару дало магчымасьць зьявіцца на сьвет славутым скрыпкам Страдываріуса (1644-1736 г.), а кляві-цымбалам ператварыцца ў сучасныя рояль і піяніно.

Мы мелі магчымасьць на конкрэтным матар'яле бачыць, як ад становішча грамадзкіх, вытворчых сіл залежыць мастацтва, а ў дадным выпадку адзін з яго відаў—музыка. Такое становішча вытворчых іх было скарыстана музыкамі, а ў першую чаргу Бахам. Бах выконваў „социяльны заказ" свайго часу і сваёй клясы.

Бах скарыстаў старую касьцёльную поліфонію (шмат галосьсе) для фугі і араторыі. Гэтыя формы давёў да віртуознасьці, што дало магчымасьць выкінуць касьцёльную нэндзу і напоўніць фугі і араторыі сур'ёзнай і глыбокай лірыкай, пак зашь пад новага чалавека—буржуа, з новымі жаданьнямі і імкненьнямі, раней невядомымі старому сьвету для сваіх фуг і араторый Бах усебакова і шырока скарыстаў фортэпіяна — дасягненьне свайго часу. І толькі на падставе гэтых інструмэнтаў маглі зьявіцца рэчы Баха, Гайдна, Бэдговэна.

Зьмест і форма атрымалі органічнае адзінства. Калі-б гэтага гармонічнага адзінства і ня было, то альбо зьмест, альбо форма пераважала-б адна над адной. бо ў эпохі, падобныя той, у якой жыў Бах, гэта няўзгодненасьць магла быць. Але-ж гэта не дае нам магчымасьці адрываць форму ад зьместу і наадварот, альбо гаварыць аб бязідэйнасьці музычных рэчаў. Узыходзячая на гістарычную сцэну кляса высоўвае ўперад свой ідэолёгічны зьмест, а выходзячыя клясы смакуюць форму, наладжваюць навокал яе „пляску сьвятога Вітта". Пятроў і К-о яшчэ маюць нахальства сьцьвярджаць і ўбіваць у галовы нашай моладзі, што музыка бяз клясава і бязідэйна.

З выказанай думкі ўзьнікае такое пытаньне: паколькі Бах буржуазны музыкант, дык навошта ім карыстацца? Пролетарыяту ў спадчыну засталася каштоўная скарбніца мінулага, з гэтай скарбніцы патрэбнае вартае выбраць і паставіць на службу нашай рэконструкцыі, а дрэннае і шкоднае выкінуць.

З гэтага кароткага агляду відаць, што ў нас ёсьць яшчэ такія „тэорэтыкі" ад музыкі, якія выразна праводзяць у ёй свае антысавецкія настроі.

Падмена марксызму эклектыкай, скарыстаўшы марксыскую тэрмінолёгію, адмаўленьне клясавасьці ідэйнага зьместу музычных твораў, адмаўленьне і ігнараваньне пролетарскай музыкі, працягваньне ў музыку контррэволюцыйных. нацдэмократычных тэорыек—вось асноўныя з антысавецкіх плыняў якімі гора-тэорэтыкі, накшталт Пятрова і К-о, імкнуцца забрудзіць жывы струмень пролетарскага мастацтва.

С. ВЯЗІН.

(Працяг будзе).

УЛАДА ЗОЛАТА І ШТЫХА— НА ГНІЛЫХ ПАДПОРКАХ

УЗБРОЕНЫ ЗАРУБЕЖНЫ ПРОЛЕТАРЫЯТ НЯ ПОЙДЗЕ ВАЙНОЮ СУПРОЦЬ СССР

Сусьветны комсамол у барацьбе супроць пагрозы вайны

Агромністы рост ваеннай небясьпекі і шалёная падрыхтоўка імпэрыялістымі ўзброенага нападу ў першую чаргу на СССР, ставіць перад усім міжнародным комсамолам, як адну з важнейшых задач—разгортваньне супрацьваеннай работы.

Апошні пленум КІМ'у, які адбыўся ў канцы 1929 году, указаў, што „ў галіне актываеннай работы ўсе комсамольскія арганізацыі павінны разьвіць энэргічную дзейнасьць, з мэтай надаць гэтай рабоце сапраўды масавы характар з тым, каб яна ахапіла ня толькі рабочую моладзь, якая прызвана ў армію, але і ўсю масу моладзі".

На аснове рашэньняў пленуму ўсе комсамольскія саюзы капіталістычных краін узмацнілі сваю супроцьваенную дзейнасьць.

За мінулы год адбыліся сотні дэмонстрацыі салдат і маракоў. Гэтыя дэмонстрацыі праходзілі часткова пад лёзунгамі экономічных патрабаваньняў, але часткова насілі чыста палітычны характар і былі накіраваны супроць падрыхтоўкі буржуазінй вайны.

Ва Францыі за адны толькі першыя месяцы 1930 году адбылося 20 салдацкіх дэмонстрацый. На высьпе Олерон арыштаваныя салдаты—дэмонстранты збунтаваліся і з сьпевам „Інтэрнацыяналу" паднялі чырвоны сьцяг над баракамі. У шэрагу казарм салдаты сьпявалі рэволюцыйныя гімны. Матросы і салдаты гарнізонаў у гарадох Вэнсэне, Шарантоне і Вэрсалі арганізавалі дэмонстрацыі, пасьля якіх зьвярнуліся да Чырвонай арміі з прывітальнымі лістамі. Трэці сапёрны полк адправіў бастуючым рабочым Аляторма ліст, у якім заявіў аб сваёй з ім салідарнасьці.

У Чэха-Славакіі, у час дэмонстрацыі беспрацоўных, салдаты браталіся з рабочымі. У час забастоўкі рабочых-шкляроў урад накіраваў для аднаўленьня парадку тры батальёны салдат. Дэмостранты сустрэлі іх выкрыкамі: „Няхай жыве Чырвоная армія!" Салдаты адмовіліся разганяць дэмонстрантаў і вярнуліся ў казармы.

У Італіі, у час набору новабранцаў, сярод салдат былі ў тысячах экзэмпляраў распаўсюджаны проклямацыі.

У час манэўраў у Парме ў салдат былі выкрыты лістоўкі, заклікаючыя змагацца сроцоць вайны. Разьюшаны камандзір сабраў усіх салдат і зьвярнуўся да іх з патрыотычнай прамовай, у якой праклінаў комуністых, разлагаючы х армію.

У Польшчы, у дні набору новабранцаў, перад казармамі адбылася дэмонстрацыя жанчын Новабранцы ў адказ на прывітаньні дэмонстрантак сьпявалі „Інтэрнацыянал".

Буйныя дэмонстрацыі, у зьвязку з наборам новабранцаў, а таксама ў дні папскага крыжовага паходу адбыліся ў Грэцыі і Нямеччыне. Разгортваецца супрацьваенная работа і ў шарагу іншых краін.

Сярод салдат і матросаў у казармах і караблёх утвараюцца ячэйкі па барацьбе супроць ваннай небясьпекі. Гэтыя ячэйкі ўстанаўляюць сувязь паміж казармамі і заводамі. Аднак супрацьваенная работа комсамолу амаль усюды яшчэ вельмі слабая.

У сакавіку, у шэрагу краін будзе праведзены новы набор у армію. Комуністычная моладзь ужо пачала агітацыйную падрыхтоўку да гэтага набору. На сэкцыі КІМ'у кладзецца задача к гэтаму часу арганізаваць буйныя супроцьваенныя дэмонстрацыі пад палітычнымі лёзунгамі:

„Далоў вайну!", „За пэратвараньне імпэрыялістычнай вайны ў вайну грамадзянскую", „За абарону СССР!", „За рабоча-сялянскі ўрад!", „Супроць фашызму і соцыял-фашызму!".

Аб'яднаць увесь рух пролетарскай моладзі, якая змагаецца супроць вайны, у адзіным магутным супрацьваенным руху рабочых і салдат, узмацніць салдацкія і матроскія арганізацыцы для разлажэньня буржуазнай арміі—вось задача, якая стаіць перад камуністычнай моладзьдзю ў капіталістычных краінах у яе барацьбе супроць падрыхтоўкі новых імпэрыялістычных войн.

Джыовані.

Польшча пад пагрозай новага скарачэньня продукцыі жалеза

ВАРШАВА, 30. Польскія прамысловыя колы занепакоены тым, што ў бліжэйшы час будуць закончаны пастаўкі па савецкім заказам на жалеза і польская прамыслевасьць стане перад пагрозай новага вучотнага скарачэньня продукцыі жалеза, 90 проц. экспорту якога накіроўваецца ўжо на працягу году з лішкам у СССР.

Пат (польскае тэлеграфнае агенцтва) з гэтай прычыны піша: „У сувязі з вычарпаньнем савецкіх заказаў трэба лічыць, што ў 1931 г. магчыма абмежаваньне экспорту і тым самым скарочаньне продукцыі польскай мэталюргічнай прамысловасьці. Праўда, вядуцца перагаворы аб новых заказах. Вялікай перашкодай зьяўляецца, аднак, ня высьненае дагэтуль пытаньне аб дзяржаўнай гарантыі польскага экспорту ў СССР, з аднаго боку, і конкурэнцыя Нямеччыны і Чэха-Славакіі —з другога".

Паліцыя з шаблямі нагала атакавала дэмонстрантаў

ВЕНА, 30. Як паведамляюць з Бухарэсту, румынскія чыгуначнікі змагаюцца супроць абвешчанага скарочаньня зарплаты на 22 проц. і масавых звальненьняў рабочых. 2 тысячы чыгуначнікаў прайшлі з дэмонстрацыяй у цэнтры гораду.

Вялікі атрад паліцыі адрэзаў дэмонстрантам дарогу. Рабочыя закідалі паліцыю камяньнямі і прарвалі кардон. Паліцыя з шаблямі нагало зрабіла рэгулярную атаку і дала некальлі залпаў па дэмонстрантах.

Многа рабочых паранена. Згодна паведамленьняў, яшчэ не пацьверджаных, ёсьць некалькі забітых. Відаць, для апраўданьня растрэлу, у паліцэйскім паведамленьні сьцьвярджаецца, быццам рабочыя стралялі першым.

Звыш 200 рабочых затрыманы. З іх 29 арыштаваны.

КУРС—НА ГАСПАДАРЧЫ ПЕРАКОП!

Узмацніць кіраўніцтва „лёгкай кавалерыі", забясьпечыць актыўны ўдзел у вясеньняй пасеўкампаніі

Уключыцца ў прадвясеньнюю

Зараз на комсамол вёскі ўскладаецца адказнейшая задача: пад кіраўніцтвам партыі правесьці другую бальшавіцкую вясну, выканаць адну з баявых задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

„Лёгкая кавалерыя" ў гэтым напрамку можа і павінна зрабіць шмат чаго.

БССР павінна быць сёлета колектывізавана на 45% гэта—адна з галоўнейшых задач вясеньняй пасеўкампаніі.

БССР—рэспубліка з жывёлагадоўчым ухілам. Пляны пасеўнай кампаніі павінны быць так пабудаваны, каб забясьпечыць выкананьне задач разьвіцця жывёлагадоўлі.

Колькі, дзе і чаго будзе сеяцца, колькі падрыхтавана насеньня, як сабраны насенныя фонды, адрамантаваны сельска-гаспадарчы інвэнтар, падрыхтавана ўгнаеньне, як даведзен плян вясеньняга севу да кожнага двара як колгаснага, так і аднаасобнага—вось асноўныя шляхі, па якіх трэба накіроўваць падрыхтоўку да пасеўнай кампаніі.

Кожны атрад „лёгкай кавалерыі" павінен зараз-жа зрабіць расстаноўку сваіх сіл так, каб кожны ўдзельнік атраду абавязкова быў прымацаваны да адной з гэтых вузлавых галін для штодзённага ка[...]тролю і дапамогі ў выкананьні і падрыхтоўцы бальшавіцкай вясны!

Асаблівую ўвагу атрады „лёгкай кавалерыі" павінны зьвярнуць на праверку выкананьня пастаноў цэнтральных органаў і пастаноў прынятых самімі колгасамі, ячэйкамі, або раённай арганізацыяй па правядзеньні вясеньняй пасеўкампаніі.

Зараз-жа кожны колгасьнік павінен ведаць, што яму трэба будзе рабіць, што павінна быць зроблена ў колгасе да вясны і ўвесну, ці ёсьць у колгасе сустрэчны гаспадарчы плян, як разгорнута соц. спаборніцтва. Лёгкая кавлерыя павінна зараз-жа праверыць як выконваецца пастанова партыі і ўраду, даць цьвёрды зыданьні кулацкім гаспадаркам па пасеву.

Каб забясьпечыць пасьпяховае выкананьне пастаўленых задач „лёгкая кавалерыя" павінна ахапіць сваей работай значную частку беспартыйнай моладзі, старых колгасьнікаў-ударнікаў.

Гэтыя новыя задачы патрабуюць каб комсамольскія камітэты і ячэйкі зрабілі карэнны пералом і палепшылі кіраўніцтва „лёгкай кавалерыяй".

„Ня толькі кавалерыі, але і артылерыі не дапушчу"

У савгасе Чырвоная Зорка" (Жыткавіцкі р-н) валяецца шмат усялякага мэталёвага лому. Зьбіраць гэты лом ніхто і ня думае.

Калі „лёткая кавалерыя" Рыбтэхнікуму хацела організаваць збор лому і наогул праверыць становішча савгасу ў галіне жывёлагаўоўлі, сьвінагадоўлі і г. д.—загадчык савгасу Бародзіч не дазволіў.

— **„Я ня толькі кавалерыі, але і артылерыі не дапушчу рыцца тут у мяне".**

За зьявагу „ЛК", што „налёты" нібы робяцца ад няма чаго рабіць, Барэдзіч павінен атрымаць належнае пакараньне.

Я. Кагаюўскі

Без кіраўніцтва

Спэцыяльны работнік па кіраўніцтву працаю „лёгкай кавалерыі" пры Вузьдзенскім РК КСМ не працуе. Бюро РК ЛКСМБ таксама не ўдзяляе ніякай увагі „ЛК", а працы шмат. Напрыклад, 20 XII Вузьдзенскае раённае спажывецкае таварыства выкінула з складу ў ямы цэлы воз мазі для абутку. Мазь паўгода ляжала на складзе і псавалася.

А тысяча спажыўцоў уходзілі з крамы без абутковай мазі. Гэта-яўны факт шкодніцтва, „ЛК" нічога не зрабіла, каб папярэдзіць гэтае злачынства. Неабходна бюро РК зацікавіцца працай „ЛК", а РСІ дапамагаць і прыцягваць да працы „кавалерыстых"

Колгасьнікі

У Багушэўскім р-не ігнаруюць „ЛК".

Група „ЛК" пры Багушэўскай мястэчковай ячэйцы ЛКСМБ на працягу двух год ніякай працы не праводзіць. Ячэйка і райком ЛКСМБ ня кіруюць ёю. РСІ ні разу ня склікала нарады лёгкіх кавалерыстых.

Пры вясковых ячэйках ЛКСМБ зусім няма груп „ЛК" РК не ўдзяляе гэтаму пытаньню ніякае ўвагі.

„Л К".

Вынікі добрай працы

„ЛК" Менскага Політэхнікуму Сувязі шырока разгарнула сваю дзейнасьць.

„ЛК" першая выкрыла праявы вялікадзяржаўнага шовінізму ў тэхнікуме, дзякуючы чаму своечасова былі прыняты адпаведныя меры.

У кожнай групе створаны пасты „ЛК, якія займаюцца ня толькі выяўленьнем недахопаў, але і пытаньнямі іх зьнішчэньня.

Г. Ф.

Тварам да вытворчасьці

За апошнія месяцы значна ажывілася праца групы „ЛК" мястэчка Капцэвічы, Петрыкаўскага раёну. Зроблены „налёты" на наступныя ўстановы:—амбулаторыю, сталоўку, ачаг, ясьлі, рабкооп.

Выкрыта шмат недахопаў у гэтых установах. Па матар'ялах „ЛК" адпаведныя органы прынялі ўжо конкрэтныя захады для ліквідацыі гэтых недахопаў.

„ЛК" наладзіла цесную сувязь з насьценнай заводзкай газэтай і зьмяшчае значную частку сваіх матар'ялаў, дабіваючыся рэагаваньня на заматкі.

У час вытворчых манэўраў на заводзе „Зорка", „ЛК" устанавіла дзяжурствы, чым значна дапамагла своечасовай ліквідацыі заводзкіх прарываў.

Вельмі слаба дапамагаюць органы РСІ, ня кіруюць і ня прыцягваюць „кавалерыстых" да працы.

А.Д.

„У мяне на гэта ёсьць плянавасьць"

„ЛК" пры Выдранскай ячэйцы ЛКСМБ (Магілеўскі р-н) нічога ня робіць.

Праца атрадаў як у горадзе, так і на вёсцы заняпала. Калі скажаш кіраўніку **Альховічу** аб дрэннай працы „ЛК", дык ён толькі крычыць: „У мяне на гэта ёсьць плянавасьць". А каб праводзіць працу—дык не.

Плянавасьць — справа добрая. Трэба працаваць па пляну. Але вельмі дрэнна, калі ні з плянам, ні бяз пляну няма працы.

Зоркі

Узяцца за падрыхтоў[...]

Агульна-гарадзкая конфэрэн[...] „лёгкай кавалерыі" Менску, я[...] склікаецца 6-га лютага, став[...] сваёй мэтай падвядзеньне вынікі[...] X зьезду ЛКСМБ і IX зье[...] УсеЛКСМ для мобілізацыі ўв[...] „кавалерыстых" на хутчэйшае п[...] вядзеньне ў жыцьцё рашэньня зьездаў, для яшчэ большай мобі[...] зацыі пролетарскай грамадзкас[...] на выкананьне 5-годкі ў 4 га[...]

Як рыхтуюцца да агульна-гара[...] кой конфэрэнцыі Менску гру[...] „лёгкай кавалерыі"?

Нам удалося азнаёміцца з па[...] рыхтоўчай „працай" кавалерыі бу[...] нейшых прадпрыемстваў: „Энэргія", „Дрэваапрацоўвачнік" і „Бальшавік"[...]

Малюнак даволі сумны. Шм[...] „лёгкіх кавалерыстых" нават [...] ведаюць аб тым, што рыхтуе[...] гэткая конфэрэнцыя. На заво[...] „Энэргія" мы запыталіся ў адна[...] кавалерыстага ці рыхтуюцца я[...] да конфэрэнцыі.

—„Да якой гэта конфэрэнцы[...] У нас зьбіраюцца сходы „кава[...]рыстых", гаворым аб працы, [...] вось аб конфэрэнцыі яшчэ ня чулі[...]

І гэтак на ўсіх трох прадпрые[...]ствах. „Кавалерыя" яшчэ ня ры[...]туецца да агульна-гарадзкой ко[...]фэрэнцыі.

Неабходна зараз-жа разгарну[...] шырокую падрыхтоўчую працу [...] конфэрэнцыі, мобілізуючы ня толь[...] ўвагу кавалерыстых, але ўва[...] ўсёй заводзка-фабрычнай грамадз[...]касьці.

Зараз-жа ўзяцца за падрыхтоўк[...] да конфэрэнцыі, бо засталося мал[...] часу.

Ц.

„Усялякія чэрці ходзяць тут, ды перашкаджаюць працаваць"

У м. Ельску наглядалася нездавальненьне працоўнага насельніцтва працай Каралінскага паштовага аддзяленьня: ненормальнай дастаўкаю лістоў, газэт, часопісаў і г. д.

Гэтай справай занялася група лёгкай кавалерыі. Налёт выявіў, што лісты не дастаўляліся па некалькі месяцаў, корэспондэнцыі перадаваліся не лістаносцамі, і г. д. Падпіска на газэты на тэрыторыі Ельску зьменшылася на 30 проц.

На падставе акту „ЛК", каралінская РСІ вынесла пастанову зьняць з працы начальніка пошты Давідка.

Але скаргі насельніцтва на дрэнную працу пошты ня спыняюцца. Зрабілі дадатковы налёт па праверцы колькасьці выпісваемых газэт: „Чырвоная Зьмена", „Комсамольская Праўда", Беларуская Вёска". Давідок, будучы намесьнікам загадчыка пошты патрабаваў а[...] „ЛК" мандат. Мандату не паказалі[...] тады Давідок загадаў асвабаніць па[...]мяшканьне:

— „Усялякія чэрці ходзяць ту[...] ды перашкаджаюць толькі праца[...]ваць".

Кіраўнік групы „Кёгкай кавалерыі"

АДКАЗНЫ РЭДАКТАР—РЭДКОЛЕГІЯ

Згублены

— Комсам. біл за № 72558, на імя Леаноіч Вольгі, выд. Мен. АК ЛКСМБ.

— Біржавая картка юнсэкцыі на імя Вігноўскага Якуба, выд. Мен. Біржай Працы

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599